Кожны год 21 лютага ў штаб-кватэры ЮНЕСКА і ў яе філіялах праводзяцца выставы і прэзентацыі, якія прысвячаюцца мовам, арганізуюцца святочныя канцэрты. У адукацыйных установах праходзяць тэматычныя заняткі. Праводзяцца конкурсы сярод знаўцаў роднай мовы. Бібліятэкі арганізуюць кніжныя выставы беларускамоўных выданняў; музеі ладзяць публічныя чытанні беларускамоўных твораў пісьменнікамі, акцёрамі, мастакамі і дзяржаўнымі дзеячамі; праводзяцца агульнабеларускія дыктоўкі, прэзентацыі новых беларускамоўных кніг, беларускамоўныя дыскатэкі і канцэрты.

УДК 81-24

Студ. В.В. Краеўская, А.В. Цімашэнка
Навук. кір. заг. кафедры В.У. Русак (кафедра беларускай філалогіі БДТУ)

## ПРЫЧЫНЫ ЗНІКНЕННЯ МОЎ

Мы ведаем пра існаванне моў, на якіх у наш час ніхто не размаўляе: лацінская, санскрыт, гоцкая і многія іншыя. У нашы дні колькасць моў на планеце хутка памяншаецца, у геаметрычнай прагрэсіі павялічваецца хуткасць паглынання малых моў вялікімі. Мовы знікаюць, але новыя не з’яўляюцца. Разгледзім прычыны гэтага працэсу.

Адна з прычын – войны і фізічнае знішчэнне носьбітаў мовы. Напрыклад, іспанскія каланізатары захапілі тэрыторыю сучаснага Сальвадора, пасля гэтага ў жывых засталося зусім няшмат карэнных жыхароў – носьбітаў мовы ленка і какапера, і гэтыя мовы зніклі.

Другая прычына – эпідэміі. У мінулыя часы носьбіты мовы выміралі ў сувязі з эпідэміямі. Так, прусы (і пруская мова адпаведна) зніклі ў сувязі з эпідэміяй чумы.

Аднак часцей мовы знікаюць не так імкліва, а на працягу жыцця некалькіх пакаленняў. Як правіла, гэта абдываецца тады, калі прадстаўнікі нацыянальных меншасцей аддаюць перавагу мове, на якой больш магчымасцей атрымання адукацыі, кар’ернага росту і г.д. Знікненне мовы адбываецца ў тры этапы. Спачатку на роднай мове пачынаюць гаварыць толькі дома. Потым адбываецца забыванне адценняў значэння, мова спрашчаецца. Каб выказаць патрэбную думку, носьбіту даводзіцца звяртацца да другой мовы. Апошні этап – на роднай мове гавораць толькі старыя. Калі паміраюць апошнія носьбіты, знікае мова. Так, напрыклад, копцкая мова была выцеснена арабскай у Егіпце ў VII стагоддзі. Іспанская і партугальская мовы – мовы каланізатараў – цалкам выцеснілі многія мовы індзейцаў ў Паўднёвай Амерыцы.

Сучасная глабалізацыя, распаўсюджванне інтэрнэту спрыяе таму, што ўмацоўваюцца адны мовы і слабеюць іншыя. Па дадзеных ЮНЕСКА, з 6000 існуючых у наш час моў 3000 знаходзяцца пад пагрозай вымірання. Згодна з дактрынай ААН, мова з'яўляецца адной з асноўных каштоўнасцей грамадства, і яе гібель азначае страту ідэнтычнасці народа, а гэта наносіць шкоду чалавечай цывілізацыі ў цэлым.

Перашкодай на шляху знікнення мовы становіцца захаванне культуры малых народаў, вывучэнне фальклору, папулярызацыя роднай мовы ў дзіцячай і моладзевай аўдыторыі.

УДК 7.036.1:791(450)

Джанлука Джаки
Науч. рук. ст. преп. Т.Ф. Ковалевская
(кафедра белорусской филологии, БГТУ)

## НЕОРЕАЛИЗМ В ИТАЛЬЯНСКОМ КИНО

Итальянский неореализм – крупное художественное явление послевоенных лет. Его самыми важными представителями являлись Витторио де Сика, Лукино Висконти, Роберто Росселлини, которые известны благодаря фильмам «Рим – открытый город», «Земляк» (Росселлини); «Шуша», «Умберто Д.», «Похитители велосипедов» (Де Сика); «Земля дрожит», «Одержимость» (Висконти).

Итальянский неореализм возник как следствие влияния социалистических и коммунистических идей, как результат движения Сопротивления, борьбы против фашизма. Прямое влияние на неореализм оказали теоретические работы и фильмы Всеволода Пудовкина и Сергея Эйзенштейна, ленты Дзиги Вертова и Эсфири Шуб, фильм Николая Экка «Путёвка в жизнь» и другие картины советских режиссёров 20-х – начала 30-х годов.

В основе неореализма лежат тончайшие политические, социальные и нравственные идеи и чувства. Характерными его чертами являются вера в лучшее будущее, несмотря на послевоенные трудности в стране, и особое внимание к «маленькому простому человеку», к обычному, непримечательному жителю – рыбаку, рабочему на заводе, крестьянину.

Неореализм стремился к воссозданию реальности, отражая её без прикрас, был максимально приближен к настоящей жизни. Надеясь на национальное возрождение после войны, молодые режиссёры хотели снимать кино, хотя не всегда это было возможным. Они выбирали непрофессиональных актёров и снимали на реальных улицах или